# ДЗЁНЬНІК МІКОЛЫ ГАНЬКА

*Яшчэ на Бацькаўшчыне Мікола на прыклад старэйшага брата пачаў пісаць дзёньнік. У адрозьненьне ад Міхася, чый почырк цяжка распазнавальны, дзёньнік мужа лёгка чытаецца, і я часта перачытваю яго, нібы зноў жывучы зь ім адным жыцьцём — нават тым, дзе мяне пакуль не было.*

Зальцбург, 1947.

Я нарадзіўся 23 мая 1924 г. на хутары Калядзіна Лебедзеўскай гміны Маладэчанскага павету Віленскага ваяводзтва. Бацька мой Яўхім і матка Мар'я зь сям'і Кісялёў мелі досыць вялікую гаспадарку й жылі, можна сказаць, заможна. Я — самы меншы ў сям'і. Акром мяне, яшчэ два браты: самы старэйшы — Мішка (Міхал) і сярэдні — Васіль.

Дзяцінства прайшло без асаблівых выпадкаў, і нічога цікавага аб ім сказаць не магу.

Маючы шэсьць гадоў, я вучыўся ўжо граматы, а маімі першымі вучыцелямі былі старэйшыя браты й бацька. У школу пачаў хадзіць, маючы дзевяць гадоў. Адразу пайшоў у другую клясу, але доўга не хадзіў, на другі дзень пайшоў у трэцюю і ўжо быў самым праўдзівым вучнем. Вучыўся я даволі добра й з клясы ў клясу пераходзіў штогоду з добрымі й выдатнымі вынікамі. Пачатковую школу ў Насілаве скончыў у 1938 г., пазьней вучыўся ў Маладэчне.

Паважнае ўражаньне зрабілі на мяне падзеі 1939 г. Зьмена ўлады. Распалася польская дзяржава, прыйшлі саветы. Я хадзіў далей да школы ў Маладэчне, дзе й жыў.

За час панаваньня саветаў гаспадарка стала запускацца, бацькі мелі даволі клопату. Мішка працаваў па чарзе настаўнікам, а пазьней бухгальтарам. Васіль быў дома, а пазьней — на шпала-прапітачным заводзе ў Маладэчне. Гэтак прыйшоў 1941 г. Хоць на Захадзе была вайна, але ў нас быў «мір».

22 чэрвеня (гэта была нядзеля, стаяла прыгожая сонечная пагода) прыляцела вестка, што немцы пачалі вайну з саветамі.

У нас дома было сумна. Мішка 2 мая т. г. пайшоў у войска і ў гэты час быў на вайне. У панядзелак на гасьцінцы быў рух ва ўсходнім напрамку. У аўторак раніцай прыляцелі нямецкія штукасы[1] . Бомбы, зэнітная артылерыя, кулямётная стральба, дым, агонь — таго яшчэ я ніколі ня бачыў, і гэта зрабіла на мяне вялікае ўражаньне. Удзень тое самае. З Маладэчна ўцякаюць людзі, места гарыць. Кажуць, што прыйдуць немцы. У сераду па палудні ў кірунку Смургоняў падняўся дым, а каля гадзіны пятай пачалася артылерыйская стральба. Мы пахаваліся ў склеп, а пасьля гадзіны зрабілася ціха. Мы вышлі й пабачылі на гасьцінцы вялікі рух: танкі, самаходы й г. д. Гэта былі немцы.

Цэлае лета перастрывалі дома. Розныя перажываньні й цікавыя гісторыі, хоць пра гэта ня варта ўспамінаць.

Восіняй ажаніўся Васіль. Жонку ўзяў зь незаможнай сям'і, але чэсную й добрую дзяўчыну. Так прыйшла суровая зіма 1941—1942 гг. Яна прайшла без асаблівых здарэньняў. Я працаваў дома, хадзіў ад часу да часу на работу ў Маладэчна й г. д.

Улетку 1942 г., здаецца, было гэта ў пачатку ліпеня, мы атрымалі ліст ад… Мішкі, якога лічылі загінуўшым. Канца краю не было радасьцям. А праз тыдзень вечарам (мы ўжо спалі) пастукаў у вакно начны госьць. Уся сям'я паднялася на ногі. Амаль нічога не сказаў пра сябе й зазначыў, што скора вяртаецца назад на працу. Толькі пазьней выявілася, дзе й што ён робіць.

Восіняй я пайшоў у школу, каб атрымаць якіясь паперы аб заканчэньні хоць якой школы. 15 лютага ў Васіля й Надзі нарадзіўся сын (назвалі яго Мішка). Спраўлялі паважныя хрэсьбіны. Аднаго разу прыехаў Мішка дамоў і сказаў, што ён выступае на палітычную арэну й пра яго будзе ведама амаль па ўсёй Беларусі.

22 чэрвеня 1943 г. быў заснаваны ў Менску СБМ, шэфам якога быў ён. Мы з таго повада пераехалі ў Маладэчна дзеля прыватнай бясьпекі. Восіняй я пайшоў вучыцца ў Гандлёвую школу. Але гэта мяне не задавальняла. З пасярод вучняў набіралі хлопцаў на курс кіраўнікоў СБМ. Я запісаўся й рашыў пакінуць бацькаўскі дом і пайсьці працаваць на карысьць свайго народу. Дастаў паперы, пропуск на праезд чыгункай і сабраўся ў дарогу немаведама як надоўга.

6.XI.43. Субота. Шэф не прыехаў. Заўтра паеду на курс малодшых кіраўнікоў СБМ да Альбэртына каля Слоніму. Яшчэ вечарам сабраў усе патрэбныя рэчы, яду й г. д.

[1] Ідзецца пра мадэль нямецкіх самалётаў «Юнкерс» — *Ju87.*



11.XI.43. Я й яшчэ трох хлопцаў едзем у Менск. Вельмі рана, але цягнік спазьніўся, і мы выехалі аж у 2-й гадзіне па палудні. Яшчэ на станцыі ў Маладэчне спаткалі сябру Пагуду, які пазьней быў у нас за праваднiка. Ехалі даволі добра, хоць язда ў таварным вагоне ня вельмі цікавая, але гэта нічога, абы шчасьліва. Прыехалі даволі позна. Начаваць пайшлі ў Дом моладзі (3 км ад станцыі), каля хлебазаводу. Ноччу ў першы раз паспрабаваў «салдацкага хлеба».

12.XI.43. Раніцай выехалі зь Менску на Баранавічы. Дарога бясьпечная, цягнік ідзе даволі хутка. Ужо пачынаецца зіма. Падае сьнег. У Баранавічах прыйшлося доўга чакаць на цягнікі, выехалі далей аж у 4-й гадзіне. Дарога на Слонім ідзе празь лес, а ў гэты час гэта небясьпечна. Цягнік едзе паволі. Пару сяброў, што тут сядзяць больш, апавядаюць розныя небыліцы, а нам ужо й на страх трошкі забірае.

Даволі позна прыехалі на маленькую станцыю Альбэртын. Праходзім каля возера, і тут жа зараз лягер. Нас легітымуюць вартавыя. Нас зараз разьмяшчаюць і, павячэраўшы, што хто меў, ідзём спаць.

13.XI.43. Першы дзень у лягеры. У 6.00 пабудка сама, зразумела, што я й яшчэ пару навічкоў спазьніліся на зборку й за тое прыйшлося падмятаць падвор'е (гэта паўтаралася праз пару дзён).

Пасьля гімнастыкі мыемся, сьцелем койкі, падмятаем залю й чакаем на сьнеданьне. 7.00 — кава, хлеб з маслам або мармэлядай. Пасьля сьнеданьня сякая-такая праца над упарадкаваньнем лягеру й прыгатаваньнем яго да курсу. У 12.00 абед (зупа й хлеб), пад'есьці можна (хто мала есьць), але скора будзеш галодны. Пасьля абеду тое самае, што й перад абедам. У 6.00 вячэра (зупа альбо кава, хлеб, трошкі кілбасы альбо масла (малака мама не дае).

Пасьля вячэры воддых і ў 9.00 спаць.

14.XI.43. Нядзеля. Сягоньня пабудка а 7.00. У 8.00 кава, і пасьля хто куды.

Лягер і ўдзень і ўночы ахоўваецца вартай, якая складаецца з удзельнікаў курсу. Вось і мне прыйшлося папробаваць як навічку «салдацкага хлеба». Ідзе дождж, але маю варту пры галоўнай браме, і можна схавацца ў будцы. Пасьля абеду другая шыхта, і аж да вечара вольны. Але тут прыйшлося трохі горш. Начная варта ёсьць даволі адказная, і трэба быць прыгатаваным да ўсяго. Мой пост №4 на гары ў вакопе. Над галавой шуміць лес, направа, за 200 мэтраў, возера, там стаяць яшчэ

нашы тры пасты, а налева, 75 мэтраў, паліцыйны пост. Зьмена штодзьве гадзіны. Тут я й пачаў сваю кар’еру. Ужо другая гадзіна па поўначы.

15.XI.43. Раніцай хадзіў у Слонім па «работнікаў». Пасьля сьнеданьня заняткі, абед і зноў заняткі аж да вечара. Уночы варта.

16.XI.43. Паганае шчасьце: амаль кожны дзень варта да 10.00 гадзіны бязь сьнеданьня. Прыйшлося мне раздаваць абед. Пасьля абеду яшчэ адна зьмена варты. Нас разьдзялілі на дружыны.

17.XI.43. Прыехаў праваднік зь Менску. Сёньня пасьля абеду пачатак курсу. Падняцьце сьцягу адбылося ўрачыста. Пазьней быў якісь там рэфэрат, вячэра й воддых.

18.XI.43. Сяньня асаблівага нічога не было. Заняткі на полі, рэфэраты, сьпевы й яшчэ там штось.

19.XI.43. Падае дождж. Я маю сяньня варту ўдзень і ўночы. Трошкі непрыемна, але нічога ня зробіш. Хоць сяньня падае за каўнер, але вінтоўку трымаю напагатове.

20.XI.43. Вот ужо мінуў тыдзень, як прыехаў у Альбэртын. Цікава, што там падумаюць людзі пра мяне дома. Выслаў ліст да Мішкі.

Курс у Альбэртыне я скончыў добра. Дастаў тры лычкі[2]. У пачатку сьнежня паехаў у Менск трымаць варту пры Доме моладзі. Было нас трох. Варта не была такая трудная ў параўнаньні з Альбэртынам, але ўсё ж такі варта, а найгорш, што трэба было штомінуты падцягацца й стукаць абцасамі (праўду кажучы, скора панаадвыкаліся), але гэта нічога, затое было весела й міла. Штодня прыяжджалі «сьвежыя хлопцы» (дзяўчаты таксама). Тут месьціўся цэлы штаб…

Як я прыехаў, М[іхася] не было (быў дзесьці на выезьдзе). Я быў у зялёным драліху (тканіна, зь якой рабілі ўніформу. — **Марыя Ганько**), а ён — таксама, ну мы тут і спаткаліся (абое рабое).

Гэтак я прабыў аж да самых Калядаў. Было мне добра, разнаёміўся са старшынством, а нават і пасябраваў, можна сказаць. Хадзіў да М. На кватэру, у кіно й г. д. Ад’ютантам М. быў падправаднік Гарэлік Валодзя (былы старшына савецкай арміі). Высокі, прыстойны мужчына, самы сапраўдны афіцэр. У сяброўстве вясёлы, гутарлівы, а ў службе строгі й дысцыплінаваны. На Каляды, значыць, мы й сабраліся паехаць праведаць сваіх

---

[2] Старшы грамадовы, ступень малодшых кіраўнікоў.



бацькоў: я, М. і вышэй апісаны падправаднік. Сьвята правялі ў дзядзькі Цыбульскага ў Зьдземянёве. Прыемна пабыць у кругу сваёй сям’і пасьля разлукі, хоць яна была й нядоўгай. Я быў тут найдаўжэй, а М. і Г. паехалі ў Вялейку, а пазьней вярнуліся, і мы на наш Новы год паехалі назад. Ведама, вяртаючыся з дому, узяў сала, гарэлкі й яшчэ там штось.

15.01.44. У нас спраўлялі елку, але я якраз меў варту, а пазьней выпілі добра зь Янкам Асіпчыкам, і далей ня знаю, што было. Толькі назаўтра ўсе хадзілі як сонныя, і беспарадак у цэлым доме сьведчыў аб чымсь, што тут магло быць добрае й благое.

А хто такі Янка Асіпчык? Гэта зьвязавы, загадчык II аддзелу (адміністрацыя). Высокі, кучаравыя валасы, досыць жвавы. Вясёлы, любіць часамі зазірнуць у чарку, досыць дысцыплінаваны. Гэта першы мой сябра, а пазьней і супрацоўнік (а лепш сказаць, мой шэф). Яшчэ быў адзін, наш падправаднік Сяргей Бузак[3]. Акруговы кіраўнік гораду Менску. Невысокі ростам, прыгожы, вясёлы. Не ад таго, каб выпіць, але таксама што й да работы, то не астатні (былы лейтэнант Ч. Ар.). Быў яшчэ там «кот» Аляксандар (Саша) Кароткі[4]. Гэта свайго роду тып.

Паэтка (спакусьлівая) Галіна Бузук[5]. Заўсёды пры стале за абедам ці вячэрай Сяргей не даваў ёй жыць. Грамадовы Слаўко

---

[3] **Бузак Сяргей** (01.12.1920 — ?). У 1941—1942 гг. служыў у Чырвонай Арміі. Трапіў у палон, быў вызвалены. Скончыў курсы прапагандыстаў у Вустраве пад Бэрлінам (кіраўнік — Фабіян Акінчыц), увесну 1943 г. — кіраўнікоў СБМ. У студзені 1944 г. прызначаны кіраўніком Саюзу на горад Менск. У 1944—1945 гг. знаходзіўся ў Бэрліне. Паводле зьвестак кіраўніка Працоўнай групы СБМ у Нямеччыне Генрыка Барановіча, трагічна загінуў у самым канцы вайны.

[4] **Кароткі Аляксандар** (07.07.1922, Слонімшчына — ?). Нарадзіўся на Слонімшчыне. Адукацыя сярэдняя, да пачатку нямецка-савецкай вайны працаваў выкладчыкам. У 1943—1944 гг. — культурны рэфэрэнт СБМ. У 1944—1945 гг. быў кіраўніком лягеру юнакоў і юначак СБМ у Дэсаў (Усходняя Нямеччына).

[5] **Бузук Галіна** (04.08.1924, в. Бор, сёньня Наваградзкі р-н Гарадзенскай вобл. — ?). У 1942—1943 гг. працавала ў Наваградку ў аддзеле працы. Скончыла курсы юначак у Драздах (пад Менскам). Культурны рэфэрэнт СБМ пры Кіраўнічым штабе, рэдактар часопіса «Служба юначак». Загадам Шэфа СБМ ад 29.12.1944 нададзена званьне важатай. У 1944—1945 гг. апекавалася юначкамі ў працоўных лягерах ва Ўсходняй Нямеччыне: Дэсаў, Крымічаў, Мульдэнштайн. Далейшы лёс невядомы.

Пушкін, комік і гэтак падобны, пазьней яго выгналі. Ст. праваднік Стэльмах Дзьмітры[6], заступнік шэфа, паважны, але таксама й вясёлы, любіў зайграць у карты, выпіць, але дысцыпліну трымаў (былы ст. лейт. Ч. Ар.). Галоўная праваднічка Абрамава[7], баба ў даслоўным слове таго значэньня.

У канцы студзеня 1944 г. езьдзілі мы (я, Асіпчык і грамадовы Грынкевіч) у Нямеччыну за адзежай і яшчэ за якімісь там рэчамі. Я з адным немцам аб'ехалі многа гарадоў. Быў у Бэрліне, Гамбургу, а пазьней я трафіў на Судэтах. Падарожжа выпала добра, толькі што яно мучыць чалавека. У Гамбургу ўжо зімна, а як мы вярнуліся назад у Менск, то тут дваццаць марозу.

Адразу пасьля звароту зь Нямеччыны нас загналі на курс сярэдніх кіраўнікоў.

Курс праходзіў у нас у Менску, у Доме. Былі на ім амаль усе зьвязавыя й грамадовыя з папярэдніх курсаў з Альбэртына. Тут больш было выкладаў на палітычна-грамадзкія тэмы, як у Альбэртыне. Займаліся, праўда, і страявой падрыхтоўкай. Падчас курсу быў маленькі скандал з Рыжым[8], а пазьней нават з Родзькам. Па сканчэньні курсу я атрымаў ступень старшага зьвязовага, а Асіпчык Янка — сэкцыйнага. Цяпер я лічыўся ўжо афіцыйным супрацоўнікам[9]. Так падышоў дзень 25 Сакавіка.

[6] **Стэльмах Дзьмітры** (1919—?). У 1941—1942 гг. у Чырвонай Арміі, трапіў у палон, скончыў курсы прапагандыстаў у Вустраве, кіраўнікоў СБМ. Узначальваў менскую гарадзкую арганізацыю СБМ, быў намесьнікам Міхася Ганька. У студзені 1944 г. прызначаны загадчыкам курсаў кіраўнікоў СБМ у Альбэртыне. Улетку 1944 г. пакінуў Беларусь, выкладаў у роце СБМ у Бэрліне. Паводле зьвестак Генрыка Барановіча, трапіў у палон і быў прымусова вывезены ў СССР, дзе адбываў зьняволеньне ў савецкіх папраўча-працоўных лягерах.

[7] **Абрамава Надзея** (1907—18.02.1979). Паводле адукацыі — лекар. Галоўны кіраўнік юначак СБМ. Пасьля 1944 г. жыла ў Нямеччыне (пад прозьвішчам Тэадаровіч), працавала ў Мюнхэнскім Інстытуце Вывучэньня СССР. Аўтар некалькіх працаў, прысьвечаных перасьледу рэлігіі ў СССР, рэдагавала часопіс «Рэлігія й атэізм у СССР» (на нямецкай мове).

[8] Маецца на ўвазе вядомы рэлігійны й грамадзкі дзеяч **Рыжы-Рыскі Ўладзіслаў** (1925—1978). У 1944 г. быў кіраўніком аддзелу моладзі Беларускай Цэнтральнай Рады.

[9] Мікола Ганько загадам №19 ад 09.03.1944 быў вызначаны кіраўніком складу ў Доме моладзі.



Былі ўрачыстасьці на вайсковым могільніку[10]. Я, грам[адовы] Марко[11], с[тарэйшы] грам[адовы] Грынкевіч і грам[адовы] М. трымалі ганаровую варту. 45 хвілін адстаялі, не зварухнуўшыся, у сакавіковы дзень. Вельмі падробна падзеяў апісваць ня буду.

У нас у Доме адбываліся цяпер курсы санітарак, гаспадыняў і таму падобнае.

На Вялікдзень быў я дома з Нарушэвічам Расьціславам[12] (сэкцыйны), які працуе ад лютага ў аддзеле прапаганды.

У маі бальшавікі пачалі больш актыўна дзейнічаць на фронце, а тым самым амаль кожную ноч да нас наведваліся бальшавіцкія самалёты. Спачатку было трошкі страшнавата, але пазьней прывыклі. На Сёмуху (6 чэрвеня) быў я яшчэ раз дома, ніколі ня думаў, што гэта ўжо астатні раз. Тым разам былі мы з падправадніком Бузаком, былі мы са зброяй, і трошкі нарабіў скандалу ў нашым лесе з адным чалавекам з Насілава.

Гэтак прыйшло сьвята 22 чэрвеня. Выдатная пагода й сьвяткаваньні ўдаліся вельмі ўдала. Я таксама браў чынны ўдзел. Шмат кіраўнікоў было адзначана мэдалямі, а некаторыя дасталі вышэйшыя рангі. Я, праўда, нічым не адзначыўся, то гэта мяне не касалася.

Пасьля сьвята жыцьцё ішло сваім звычайным шляхам. Удзень працаваў, гэта значыць, разоў пяць хадзіў з Дому да Рады, з Ц[энтральнай] Р[ады] да Гэн[эральнага] Кам[ісарыяту] і г. д. Увечары адведвалі нас «Ванькі»[13], а ў гадзіны 3.00 па поўначы лягалі спаць.

На адным курсе я падчас палёту «Ванькаў» пазнаў адну дзяўчыну. Яна называлася Зіна Макарава. Я не адчуваў, але патроху закахаўся ў яе. Але з гэтага нічога ня выйшла, бо лёс хацеў іначай, і я толькі пасьля доўгі час мучыўся.

[10] Вайсковыя могілкі ў Менску.

[11] Напэўна, памылковае напісаньне. Маецца на ўвазе **Маракоў Уладзімер** (19.07.1926, Менск — 30.10.1971). Брат рэпрэсаванага пісьменьніка Валерыя Маракова й грамадзкага дзеяча Леаніда Маракова. Намесьнік кіраўніка менскай гарадзкой арганізацыі СБМ. Улетку 1944 г. выехаў зь Беларусі, аднак вярнуўся ў 1945 г. Арыштаваны ў 1946 г. і асуджаны на 25 гадоў лягераў. Пакараньне адбываў у Нарыльску. Вярнуўся ў Менск у 1956 г.

[12] **Нарушэвіч Расьціслаў** (06.02.1921 — ?). Прэс-сакратар СБМ.

[13] Ідзецца пра катэгорыю самалётаў, якія пры любым становішчы штурвала не «завальваліся» на бок.

27 чэрвеня ў Менску адбываўся II-гі Ўсебеларускі Кангрэс. Удзелу я ня браў (меў іншы занятак), але пераажыў тое самае, што і ўсе іншыя.

28 чэрвеня пачалі адбывацца грозныя падзеі на фронце, і тут трэба было думаць пра эвакуацыю.

29 чэрвеня раніцай мяне Шэф выправіў зь дзьвюма скрынкамі розных папераў у Альбэртын, але адзін я нічога ня мог зрабіць, і яны падчас бамбёжкі ў Баранавічах пайшлі ў іншы кірунак і так дзесь прапалі. Я прыехаў у Альбэртын да ст. пр. Стэльмаха, адкуль меліся адпраўляцца далей у разе патрэбы на захад. Па дарозе да Альбэртына, едучы вайсковым эшалёнам, наехалі на міну. Вынік быў брутальны. З Палонкі да Альбэртына прыйшлося ехаць на плятформе, так што мы выглядалі, як чэрці.

30.VI.1944. Галоўны адзежавы магазын, а разам і Школа-Альбэртын заладаваліся на транспарт і, ужо гатовыя да ад'езду, чакалі на станцыі ў Слоніме. Тут былі два немцы, а рэшта — нашы. Штандаровы Стэльмах, сэкцыйны Юльлян Жэрка, старшы зьвязовы Жаромскі, я, зьвяз. Паўловіч, старшы грамадовы Каханоўскі, грам. Сьценьнік[14] і яшчэ пару хлопцаў і малодшых кіраўнікоў, пэрсанал кухні з кухарам на чале.

1 ліпеня мы рушылі ў напрамку Варшавы. Дарога ішла празь лес, так што трэба было амаль увесь час быць напагатове.

2 і 3 ліпеня стаялі ў Варшаве. Адну ноч былі ў *entlohnung*[15] і быў алярм.

З 3 па 4 ліпеня выехалі цягніком далей. Да нас далучалася яшчэ група дзяўчат з Баранавічаў. Ехалі амаль што безь вялікіх перапынкаў у напрамку Лодзь, Брэслаў[16], Рацібор[17] і аж па астатку дасягнулі цэлі — Тропаў[18]. Было гэта 7 ліпеня ўвечары. Тут разьмесьціліся на адным стадыёне ў Доме спорту. Прасядзелі мы тут штось амаль цэлы тыдзень. За гэты час прыйшоў наш транспарт з уніформай. Яго адставілі й зладавалі 11 кіля-

[14] **Сьценьнік Пётра** (18.09.1920, паводле іншых зьвестак, нарадзіўся ў 1914 г. — ?). Паводле адукацыі — настаўнік. Кіраўнік СБМ на Вялейскую акругу. Улетку 1944 г. выехаў у Нямеччыну, дзе быў схоплены саветамі й дэпартаваны ў СССР.

[15] Звальненьне (ням.).

[16] Сёньняшні Вроцлаў.

[17] Сёньня Рацібуж (*Racibórz*), Сьлёнзкае ваяводзтва Польшчы.

[18] Сёньня Опава (*Opava*), горад у паўночна-ўсходняй частцы Чэхіі.



мэтраў у аднэй вёсцы ў школе. Сюды, г. зн. у Тропаў, прыехала ўся наша брацiя зь Менску. Але яны доўга не затрымаліся. Паехалі ў Мальту[19]. Каля Шпіталю[20] ў Альпах на адпачынак. Пабылі там штось дзьве нядзелі й зноў прыехалі да нас, гэтым разам ужо ў Шэнтайн. А я, Янка Каханоўскі й малы Сьценьнік ужо працуем у новым магазыне. З намі е адзін немец, Шледар.

Зразу жылі проста ў магазыне, а пазьней — у гасьцініцы. Наагул, жыцьцё было рознае, часамі было добра й блага.

Вяртаюся да цэлай нашай групы. Вярнуўшыся з Мальты, былі штось яны пару дзён, а там — куды каго. Адны ў Бэрлін, другія ў іншыя гарады Нямеччыны, а тут засталіся ўсяго Шэф, Нарушэвіч, Кароткі ды чатырох нас. Празь нейкі час Штаб выехаў у Тропаў і там прымясьціліся і ўсе нашы апошнія. Сьценьніка й Каханоўскага адправілі ў Бэрлін, і так у Жывоціцах[21] астаўся я ды Янка. У гэты час жылося даволі добра. Да нас прыяжджалі Нарушэвіч ды Шэф, мы часамі сабе нават і па чарцы пастараліся. Кароткага за якісь там «злачын» выслалі ў Шпандаў, а Янка паехаў на курс нямецкай мовы ў Бэрлін. У Жывоціцах я застаўся адзін, а ў Тропаў — Шэф і Росьцік[22]. Было яшчэ ў Тропаў пару дзяўчат. Галоўная[23], Зоська[24], Міхаліна[25] й яшчэ пяць дзяўчат.

[19] Мястэчка ў паўднёвай Аўстрыі.

[20] Маецца на ўвазе горад Шпіталь-ан-дэр-Драв (Шпіталь-на-Драве), горад у паўднёвай Аўстрыі (зямля Карынтыя), недалёка ад мяжы з Італіяй.

[21] Напэўна, маецца на ўвазе сёньняшні чэскі горад Гладкі-Жывоціцы, непадалёк ад Опавы, у трохкутніку Опава—Аламоўц—Астрава.

[22] Ідзецца пра Расьціслава Нарушэвіча.

[23] Надзея Абрамава.

[24] **Аляхновіч Зося** (**Зоф'я**) (07.03.1926, Глыбокае — ?). Ад 31.05.1944 — кіраўнічка арганізацыйнага аддзелу СБМ. Пасьля вайны жыла ў Польшчы, паводле іншых звестак — у Аўстраліі.

[25] **Татарыновіч Міхаліна** (01.11.1908, в. Гайнін, сёньня Ляхавіцкі р-н Берасьцейскай вобл. — 15.12.1987). Сястра слыннага рэлігійнага каталіцкага дзеяча, пралата Пётры Татарыновіча. Скончыла Віленскую беларускую гімназію, студыявала францускую філялёгію ў Віленскім унівэрсытэце. Падчас нямецкай акупацыі — намесьніца кіраўнічкі юначак на Баранавіцкую акругу. Улетку 1944 г. пакінула Беларусь, апынулася ў аўстрыйскім Куфштайне. Потым пераехала ў Польшчу, жыла ў Острудзе (Вармянска-Мазурскае ваяводзтва). Неаднаразова наведвала Рым, прывозіла ад брата розныя эміграцыйныя выданьні.

Я трапіўся жыць у школу, бо немца забралі дзесь у войска, а я цяпер начальнікам магазыну. Прымаю, выдаю (а часамі й прадаю) уніформу, вяду рахункі, картатэку й г. д. Да мяне часта прыяжджаюць немцы з розных куткоў. Асабіста разьвёў трохі знаёмства з чэхамі ды немцамі. Тут яшчэ ёсьць трохі ўцекачоў розных нацыянальнасьцяў.

Яшчэ я прамінуў адзін факт. У Тропаў жыла фамілія Шэвераvых: Зіна, Жэня ды іх матка. Бывалі часамі яны ў мяне. Быў таксама й Сяргей [Бузак], госьці былі як належыць.

У такіх абставінах праходзіла маё жыцьцё. Ці мала зайшло цікавых падзеяў. Замах на Гітлера. Аліянты здабылі Францыю.

Ужо набліжалася зіма 1945 г.

Новы год афіцыйна спатыкалі ў Тропаў, а праўдзіва — у мяне ў Жывоціцах. Я расстараўся штось зьесьці й выпіць. Таксама было й на Каляды, быў Росьцік і Шэф. На наш Новы год Шэф паехаў у дарогу.

Але падзеі пачалі дзеіць. На Ўсходнім фронце Саветы пачалі афэнзіву[26], якая ім удалася. З таго вынікла загрозьлівае становішча. Шэф і Росьцік выехалі ў Бэрлін, і я застаўся сам і яшчэ некаторыя дзяўчаты. Гэта было 24 студзеня 1945 г. Пасьля гэтага я перанёсься ў Тропаў. Там працаваў на розных функцыях. Ладавалі й вывозілі магазыны, а таксама й мой з Жывоціц. Праўду кажучы, я пры гэтым яшчэ добра зарабіў. Пазьней дзяжурыў пры тэлефоне амаль па 12 і больш гадзін у суткі. Фронт быў ад нас адзін час усяго 16 кілямэтраў. Пазьней адагналі іх назад, але ненадоўга.

1.3.1945. Пад гук гарматных стрэлаў пакінулі Тропаў. Гэта быў транспарт з астаткамі нашых рэчаў і 10 плятформаў з аўтамі. Дарога была забітая розным транспартам, і мы пасоўваліся вельмі паволі. Часамі па тры й больш дзён прыходзілася чакаць на сваю чаргу. На станцыі Прэраў[27] стаялі штось тры дні. Ноччу лётаюць «Ванькі». Фэльдфэбэль Шукальскі езьдзіў у Эгер[28]. 11.3.45 едзем далей на Брно. 12.3.45 былі ў Брне, атрымалі дазвол, і дарога далей ідзе на Прагу. 13.3.45. Прыехалі ў Прагу. У вольны час паехаў у горад. Трошкі разьбіты, але пакуль гэта не мяняе аблічча. Старая добрая Прага пакінула добрае ўражаньне.

[26] Маецца на ўвазе наступ.

[27] Відаць, маецца на ўвазе горад Пршэраў (Чэхія).

[28] Сёньня Хэб, горад на захадзе Чэхіі, на мяжы зь Нямеччынай.



14.3.45. Пасьля паўдня едзем далей. Яшчэ позна вечарам прыехалі ў Пільзэн[29]. Гораду аглядаць не магу, бо цёмна. 15.3.45 выехалі зь Пільзэну на Эгер. Яшчэ таго самага дня перад вечарам былі на месцы. Тут прыйшлося трошкі папрацаваць над перагрузкай. Усе аўта пакінулі тут.

16.3.45. Выехалі з Эгеру. Яшчэ пару дзён прыйдзецца езьдзіць. Праяжджаў праз беларускі асяродак Майнінген (*Meiningen*)[30]. Мы ўжо цяпер знаходзімся ў цэнтральнай Нямеччыне й так, што адчуваецца дзейнасьць англа-амэрыканскіх налётаў. Амаль штогадзіну алярму, а часамі й налётаў.

Пасьля двухдзённай дарогі прыехалі як быццам бы на сталае месца, толькі што занадта рухлівы стаў фронт, каб гэта можна было назваць сталым месцам. Разьмясьціліся ў якімсь *Harthaus*. Стаім на падлозе (не на падлозе, толькі на саломе). Дзень і ноч выюць сырэны. Самалёты лётаюць рэдка, але метка. Уладжваем сваё жытло, якіясь складзіні й склады, але фронт набліжаецца. Тут ёсьць пару хлопцаў зь «люфтваффэ», нашы: мадзьяры, я й адзін расеец.

27.3.45. Ноччу нас паднялі на вострае нагатаваньне. 12 км — амэрыканскія панцыры[31].

Выехалі мы 28.3.45. Дарога вельмі цяжкая. Цягнікі, забітыя войскам і бежанцамі, затрымалі амаль на чацьвёра сутак. Ехалі мы гэтак у Тальгайм. Прыехалі 31.3.45 пасьля абеду. Добрыя дзьве гадзіны прыйшлося шукаць нам нашу цэль, аж пакуль на процілеглым канцы гарадка нам удалося адшукаць. Тут я спаткаў нашых дзяўчат Зузану й Валю з Тропаў (Альбэртына). Напакаваўшы некалькі куфраў і скрыняў featnaga барахла, 1 красавіка (*Prima aprillis*) мы выехалі. Тут быў праўдзівы 1 красавік. Двух шафяроў уцякло, скрыні прапалі (добра, што не зь пісталетамі й патронамі), а мы ўтрох 3 красавіка трапілі на зборны пункт у другую лінію акопаў у адну з крэпасьцяў. Тут нас трымалі тры дні. Бачыў прысуд над адным штабсфэльдфэбэлем (павесілі яго за дэзэртырства). 5 красавіка, перагледзеўшы нашы паперы, нас пусьцілі назад, так у фах мы ўжо й ня трапілі.

6 красавіка вярнуліся назад у Тальгайм. Тут былі ўжо ўцекачы ад амэрыканцаў. Тут мы перагрузіліся й аж да 15 красавіка

[29] Сёньня Пльзэнь (Чэхія).

[30] Цяпер горад у фэдэральнай зямлі Турынгія (былая ГДР).

[31] Танкі (польск.).

рабілі парадкі ў магазынах, напаўнялі, розныя рэчы пакавалі й г. д. Фронт прыходзіў ужо й сюды.

15.IV.45. Пад вечар прыехала штось 15 аўтамашынаў забіраць наш магазын. Заладавалі многа рэчаў, але яшчэ больш засталося. Я думаў, што таксама астануся, але прыйшлося ехаць. Ехаць дык ехаць, але куды й нашто — гэта зусім няясна. Але паехалі. На другі дзень затрымаліся ў адной малой вёсачцы, перабылі там дзень. Да нас далучыліся яшчэ нашы з Бэрліна, Захаронак[32] і яшчэ пару паехалі ў кірунку Мюнхэну. З намі засталіся два хлопцы з былой роты СБМ — Іван Богдан з Ваўкоў[33] і Чэсь з Валожына. Ноччу яшчэ раз вярнуліся ў Тальгайм з адным аўтам. Раніцай заладавалі, а цэлы дзень, гуляючы ў жмуркі з амэрыканскімі самалётамі, вярталіся назад. Гэта было сапраўды цікава й трошкі страшнавата, але даехалі шчасьліва.

Далейшы напрамак трымаем на Прагу. Яшчэ затрымоўваліся, вярталіся, начавалі ў лесе, аж 20.IV.45 прыехалі ў Прагу. Тут прыйшлося мне яшчэ раз спаткацца з маім братам, у суботу 21.IV.45 мы з аўтам вярталіся да фронту па якісь тавар. Пару хвілін пагаварылі, і я паехаў сваёй дарогай, а ён застаўся ў гатэлі. Назаўтра я вярнуўся й зараз жа паехаў да яго. Застаў дома, пагаварылі, і ён рашыў ісьці ў дывэрсійны «Родзькаў батальён»[34]. Яшчэ быў зь ім на станцыі, пабачыў пару знаёмых хлопцаў з суседніх вёсак, і школьных калегаў, і КахаНоўскага Алёшку. Мы мелі ехаць далей, і яны таксама рыхтаваліся ў дарогу. Гэта было 22.IV.45. Я залез паміж скрынак і праспаў усю ноч. Аж парана прачнуўся, як ехалі праз горад. Гэта быў Пасаў[35]. Зараз нас тут прывіталі нашыя старыя знаёмыя [самалёты] «Тоні». Вечарам едзем далей. Ноччу яшчэ прыехалі ў вайсковы лягер.

24.IV.45. У 11 гадзін нас тут добра перахрысьцілі «Тоні», так што ледзь выскачылі легкавой машынай з гораду. А тут у лесе ледзь не дастаў асколка ад шрапнэлі. Вечар едзем далей. Той раз прыехалі ў якіясь горы, дзе «сьвет дошкамі забіты»,

[32] **Захаронак Аўген**, ад'ютант Генрыка Барановіча (кіраўніка Працоўнай групы СБМ у Нямеччыне). Паводле адукацыі — настаўнік. Пасьля заканчэньня вайны апынуўся ў Аўстраліі. Удзелу ў беларускім грамадзкім жыцьці, праз боязь перасьледу, ня браў.

[33] Сёньня вёска ў Маладэчанскім р-не Менскай вобл.

[34] Маецца на ўвазе дывэрсійны беларускі батальён «Дальвіц».

[35] Горад на паўднёвым усходзе фэдэральнай зямлі Баварыя (Нямеччына).



зрабілі сваё й вечарам далей. Аж прыехалі ў другі закут, што чорт яго знае, дзе гэта й ёсьць, і так 27.IV.45 прыехалі ў Зальцбург (Аўстрыя). Затрымаліся каля якогась лягеру. У горад ісьці ня хочацца.

29.IV.45. Вербная Нядзеля, ну а мы палезьлі на гару, узялі літру вады й літру сьпірту, сала, хлеба й праседзелі да гадзіны шостай вечара. У Зальцбургу прабылі яшчэ два дні, даведаліся пра сьмерць Гітлера й паехалі далей. 2.V.45 былі ў Обэргайме. Назаўтра паехалі ў вёску Гінтэрзээ. Наша начальства стараецца як мага ратавацца. Пераносілі некаторыя рэчы ў горы. Я свае таксама захаваў.

Але як ні круці, трэба памярці, таксама й тут. Колькі ні трымаліся, трэба нам шукаць сваёй дарогі. 8.5.45 мы ўтрох пайшлі працаваць у тартак. Закватаравалі ў малым барачку пад гарой. Тут працуе адзін паляк і француз. Слухалі радыё. Лёндан паведаміў пра канец вайны ў Эўропе. Нямеччына капітулявала. Кажуць, што ў Зальцбургу ўжо ёсьць амэрыканцы, але да нас яшчэ не загасьцілі. 15.5.45 першы раз бачыў амэрыканскіх жаўнераў. Наш лёс вельмі няпэўны. Што нас чакае? Патроху пазнаёміліся зь людзьмі й ваколіцай. Прывыклі.

Жывём у Гімэрзээ, гэта малая аўстрыйская вёсачка паміж гораў. Прыгожая прырода, прыгожыя краявіды, толькі ўсё гэта вельмі чужое й халоднае. Мяне асабіста яно захоплівае й часамі толькі наводзіць тугу за сваім родным.

Што перажываў я ў гэты час, апісваць дакладна ня буду, хіба згадаю маю руку ды Стаха, які ня мог дачакацца на зварот дадому, а аддаў сваё маладое жыцьцё за дурную сваю галаву.

11.6.45 я зьмяніў сваё месца працы, але ненадоўга. 15.6.45 г. прыйшоў наказ усім сабірацца ехаць дадому. Мы трапілі шчасьліва ў польскі лягер як былыя грамадзяне польскай дзяржавы. 16.6 прыпісалі нас і далі памешканьне. Расейцы, украінцы ды ўсе іншыя сав. грамадзяне едуць дадому, мы яшчэ чакаем. Мае сябры падурэлі й паехалі ў зборны лягер…

Тут пачынаецца новае жыцьцё.

19.6.45 дастаў пачку з Чырвонага Крыжа. Толькі што будзе далей, то ёсьць пытаньне на парадку дня. У лягеры жывуць палякі, але таксама ёсьць і частка ўкраінцаў, былых польскіх грамадзян. Наагул жыцьцё ні сякое ні такое. Харчы слабаватыя, але можна даць рады. Тут пачынаецца зусім новае жыцьцё. З пачатку ненармальнае, а пасьля штораз стала набіраць сталага характару. Людзі ня ведаюць, што іх чакае заўтра. Хо-

дзяць гаворкі, быццам бы маюць усіх выслаць на «Родзіну» (каб яна там згарэла), а пасьля гэта прайшло. Апеку над лягерамі бежанцаў пераняла УНРРА (*UNRRA*)[36] . Харчы палепшалі, сталі даставаць цыгарэты. Я зразу быў «правянтовым» у бараку, а пазьней, г. зн. у жніўні, стаў працаваць у шавецкай майстроўні. Але там было мейсца ня вельмі добрае. У пачатку верасьня стаў на працу ў аўтамэханічны варштат (майстроўня).

Праца мне спадабалася. Тут трошкі я навучыўся сьлясарскага дзела, а таксама абжыўся з аўтамашынамі. Гэтак прайшло да канца 1945 г.

Яшчэ трошкі вярнуся назад. Зь вёскі Гінтэрзэе застаўся адзін украінец на імя Юрко Ўгорчык з Галіцыі зь вёскі Іваніўцы Каламыйскага павету[37] . Спачатку мы былі добрымі сябрамі, а што далей, то нашае сяброўства больш павялічвалася. Можа, гэта затым, што ні ён, ні я ня мелі нікога бліжэйшага, так што ў далейшым мы сталі жыць, як браты. Ён хутка дастаў працу ў амэрыканцаў, дзе й працаваў вельмі доўгі час.

Каляды й Новы год 1946 спатыкаў ня вельмі ўдала, але й нядрэнна. 1946 г. быў лепшым хіба пад матэрыяльным поглядам, але духова давялося ці мала перажыць. Розныя камісіі, праверкі й г. д. не давалі бедным DP-істам, як нас называлі, спакою. Прыйшлося мне трошкі працаваць у амэрыканцаў, што праўда, то ня грэх, пажыў дык пажыў, хіба век не забудуся. Есьці, піць, курыць — сколькі й чаго хочаш. Вялікдзень сьвяткавалі ў З (Зэксты ту) — гэтак мы называлі яго. Пасьля сьвята перайшоў у 1-шы ўкраінскі лягер Легэн. Уладкавацца туды дапамог мне Аляксей Грыцук, які быў там заступнікам камэнданта, а пазьней — кватэрмайстэрам. Тут было яшчэ некалькі беларусаў: паэта Алесь Салавей, беларускі сьвяшчэньнік а. Віктар. Некалькі хлопцаў. У п-м укр. лягеры жыў паэта Гуцька (Уладзімер Дудзіцкі), сям'я Дуброўскіх, Губартаў ды іншыя. Аказалася, што ў Зальцбургу жыве паважная колькасьць беларусаў. Нашая інтэлігенцыя задумала была выдаваць беларускі тыднёвік ды месячны часапіс. Амаль цэлы год я перапрацаваў на гэтым полі. З прычыны рэформы DP-ускай прэсы мы далей не змаглі выдаваць ані тыднёвіка, ані месячніка. Ва ўкраінскія рэдакцыі я ісьці не схацеў.

[36] *United Nations Relief and Rehabilitation Administration*, арганізацыя, створаная краінамі-пераможцамі для апекі над асобамі, што апынуліся на тэрыторыі Нямеччыны й Аўстрыі.

[37] Сёньня вёска ў Івана-Франкоўскай вобл. (Украіна).



10.3.47 я стаў на звычайную работу пры Зальцбурскім магістраце. Перапрацаваў там чатыры месяцы. Пасьля мне трапілася іншая, выгаднейшая праца на будове каналу, куды я й перайшоў 23.7.1947. Працавалі 6 гадзін у дзень з 5-дзённым рабочым тыднем, а плацілі за $9^1/_2$ і давалі дадатковыя карткі для цяжка працуючых. Гэтак я перапрацаваў да канца 1947 г. Восеньню 1947 г. (21.11) перавезьлі мяне й Юрко ў лягер Глязэнбах. Тут адсьвяткавалі Каляды й Новы год. Працаваў далей у фірме *Porr*. У сакавіку Грыцук запісаўся й выехаў у Канаду. Наагул многа нашых людзей выяжджае, трэба думаць і мне.

Аднаго разу як на сьмех запісаўся на сельскагаспадарчыя работы ў Канаду. Запісвалася многа, а зь лягеру Глязэнбаху папала ўсяго нас 6 чалавек. Тут і пайшлі камісіі адна за другой, адно толькі думалася: хто адкіне — консул, доктар ці хто? Але зусім неспадзявана першы… прыняты. Радасьці няма канца. Апошні час ня меў работы. Трошкі цяжкавата прыходзілася.

4.VI.1948. Дату гэту буду доўга памятаць. Лёс мой вырашаны, хутка прыйдзецца пакінуць Аўстрыю, Эўропу й паехаць у няведамы далёкі новы край — Канаду. Так і сталася.

11.6.48 мяне выклікалі ў пераходны лягер. Транспарт мае адысьці 15.6.48. Нарэшце мне прыходзіцца разьвітацца зь Юркам. Пражылі мы зь ім тры гады, як з братам.

Вось і той дзень. Многа народу прыйшло на станцыю ў Зальцбургу праводзіць транспарт у Канаду. Дзесь каля гадзіны 11.00 выехалі з Зальцбургу ў напрамку на Інсбрук. Вечарам таго самага дня пераехалі італьянскую мяжу й едзем па трасе Вэрона—Парма—Мілян—Турын.

16.6.48. Пасьля абеду пераехалі ў транзытны лягер, дзе чакалі да 20.6.48. У 6 гадзіне вечарам пагрузіліся на цягнік і паехалі ў Гэную. Назаўтра раніцай у 7.00. былі ў порце. Атрымаўшы паперы пасьля абеду, каля гадзіны 3.00 пачалася пагрузка на вадаплаў. Вялікі акіянскі вадаплаў «Сатурнія» выглядае вельмі прыгожа, і я маю асабліва добры настрой. У 17.20 21.6.1948 вадаплаў «Сатурнія» выехаў з порту, маючы на барту каля 3 000 пасажыраў-эмігрантаў. У тым ліку й я.

Бывай, Эўропа! Некалькі дзён падарожжа па Атлянтычным акіяне — і будзем у Канадзе. Знаю, што перажыў на старой зямлі, знаю, як і нашто. Цяпер еду ў нязнаны сьвет, каб хіба нанова пачынаць жыць, але як? Бывай, Эўропа й мая дарагая Бацькаўшчына Беларусь!

